УДК 811.161.3’0

І. В. Наўроцкая, магістр філалагічных навук, выкл.
(БДУІР, г. Мінск)

# ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў ГАЛІНЕ ДЫЯХРАНІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Гістарычны вектар моўнага развіцця прадстаўлены ў фундаментальных работах, якія разглядаюць гісторыю літаратурнай мовы 1920–1930-х гг. і ўтрымліваюць звесткі адносна яе эвалюцыі і дынамікі, у тым ліку выяўляючы заканамернасці функцыянавання беларускай мовы на сучасным этапе [гл. напрыклад, 1, 2, 3]. У плане моўнага развіцця 1920–1930-я гг. – адметны гісторыка-культурны перыяд, паколькі нацыянальная мова абслугоўвала ўсе сферы грамадскага жыцця. Пра гэта сведчыць, напрыклад, выдавецтва вялікай колькасці разнастайнай літаратуры на беларускай мове. Так, на тэрыторыі БССР у 1922 г. беларускамоўная літаратура складае 17,7% ад агульнай колькасці кніг, а праз 10 гадоў, у 1932 г. – 85,5% [4, с. 211]. У 1920-я гг. арыгінальная і перакладная навуковая літаратура шырока прадстаўлена ў тэматычных і жанравых адносінах [5].

У XXI ст. рэдкія выданні добра захаваны, прадстаўлены ў бібліятэках для шырокіх колаў чытачоў, у адрозненне, напрыклад, ад 1950 – 1980-х, калі доступ да некаторых крыніц быў абмежаваны [2, с. 5; 6, с. 4]. У Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюцца праекты па ўвядзенні ў навуковы ўжытак літаратуры акрэсленага перыяду. Так, на сайце Нацыянальнай бібліятэкі і ў яе лакальнай сетцы прадстаўлена вялікая колькасць электронных дакументаў – аблічбаваных копій выданняў 20–30-х гг. XX ст. Распрацаваны зводны электронны рэсурс “Нацыянальная бібліяграфія Беларусі”, які дазваляе ажыццяўляць пошук выданняў (з 1517 г. па цяперашні час) у бібліятэках і ўстановах Беларусі, а таксама па-за межамі краіны. Сэрвіс даступны па адрасе http://eir.nlb.by. Аднак неабходна заўважыць, што існуе патрэба ў поўным каталогу друкаванай кнігі Беларусі перыяду 1920 – 1930-х гг., створаным з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій. Гэта дазволіць найбольш поўна прадставіць рэпертуар нацыянальнай кнігі і закласці трывалыя асновы «для вывучэння працэсу станаўлення і развіцця ўсіх сучасных навук» [7].

У даследаваннях па гісторыі мовы неаднаразова адзначалася, што вялікую колькасць тэкстаў неабходна апрацоўваць з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій [8, с. 174; 2, с. 300].

У сваю чаргу гэта дазваляе якасна прааналізаваць цэлы масіў лінгвістычнай інфармацыі і атрымаць абгрунтаваныя высновы на падставе квантытатыўных даных. Пад выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій у дыяхранічных даследаваннях (1920–1930-я гг.) маецца на ўвазе наяўнасць электроннага тэксту-крыніцы і адпаведнага праграмнага забеспячэння з магчымасцямі аўтаматычнага пошуку па тэксце неабходнай словаформы, марфемы або зададзеных параметраў. Так, тэкст, прадстаўлены ў лічбавай форме, можна выкарыстоўваць у праграмах, якія аўтаматызуюць пошук адпаведнай словаформы, параўноўваюць некалькі выданняў аднаго твора або арыгінал і яго пераклад, адлюстроўваюць вынікі параўнання ў асобным дакуменце. Гэта істотна для выяўлення дынамікі моўнага развіцця, паколькі супастаўленне варыянтаў аднаго і таго ж тэксту, выдадзеных у розны час, выступае надзейным паказчыкам моўных зменаў [8, с. 174; 2, с. 300], дэтальнае параўнанне арыгінальнага і перакладнога тэкстаў выяўляе глыбінныя заканамернасці моўнага функцыянавання, на якія можна не звярнуць увагі, карыстаючыся выключна перакладам [3, с. 14].

Асноўныя цяжкасці пры гэтым звязаны з лічбавай копіяй, якая пераважна ўяўляе сабой PDF-файл, дзе тэкставы слой не распазнаны, пададзены гатовым малюнакам. З аднаго боку, гэта абгрунтавана прадстаўленнем у віртуальным асяроддзі надрукаванай кнігі з захаваннем усіх элементаў яе афармлення, з іншага – узнікае неабходнасць распазнавання тэксту для далейшага прымянення інфармацыйных тэхналогій у даследаванні. З выяўленнем тэкставага слою файла PDF у выданнях акрэсленага перыяду выяўляюцца наступныя праблемы. Па-першае, паліграфічнае афармленне кніг амаль стогадовай даўніны не заўсёды дазваляе праграме якасна правесці распазнаванне, гатовы тэкст таксама патрабуе уважлівай вычыткі і вымагае шматлікіх карэкціровак, паколькі мова пачатку XX ст. і пачатку XXI ст. адрозніваюцца ў тым ліку арфаграфіяй, лексікай. Па-другое, не ва ўсіх праграмах распазнавання ўбудавана магчымасць выбару беларускай мовы, што таксама зніжае якасць атрыманага гатовага тэксту і адпаведна вымагае правак. Тым не менш, сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі імкліва развіваюцца і дазваляюць апрацоўваць файлы самай рознай складанасці, што паспрыяе якасці дыяхранічных даследаванняў па беларускай мове ў тым ліку. Як адзначаюць навукоўцы, «у XXI стагоддзі праекты па стварэнні інфармацыйных сістэм і тэхналогій з’яўляюцца адным з прыярытэтных і найбольш перспектыўных напрамкаў у развіцці гуманітарных ведаў і філалагічных дысцыплін у прыватнасці» [10].

Такім чынам, распрацоўка якаснага праграмнага забеспячэння для даследаванняў у галіне гісторы мовы, а таксама стварэнне поўнай бібліяграфіі выданняў 1920 – 1930-х гг. з’яўляюцца важнымі задачамі для даследаванняў у галіне філалагічных навук, што дазволіць якасна дапоўніць гісторыю беларускай мовы, выявіць асаблівасці фарміравання яе нормаў, стыляў і спецыфіку функцыянавання на сучасным этапе.

ЛІТАРАТУРА


1. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы : у 2 т. – Мінск : Навука і тэхніка. – Т. 2. / І. Крамко, А. Юрэвіч, А. Яновіч. – 1968. – 342 с.

2. Запрудскі, С. М. Беларускае мовазнаўства і развіццё беларускай літаратурнай мовы: 1920–1930-я гады / С. М. Запрудскі. – Мінск : БДУ, 2013. – 367 с.

3. Кулеш, Г. І. Мова беларускага заканадаўства XX стагоддзя: генезіс і эвалюцыя / Г. І. Кулеш. – Мінск : БДУ, 2015. – 303 с.

4. Гісторыя беларускай кнігі. Т. 2: Кніжнасць новай Беларусі (XIX – XXI стст.) / рэд. В. В. Антонаў, М. В. Нікалаеў. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2011. – 435 с.

5. Наўроцкая, І. В. Крыніцы навуковага стылю беларускай літаратурнай мовы 1920-х гг. / І. В. Наўроцкая // Мова і літаратура : матэрыялы 72-й навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў філалагічнага факультэта БДУ, Мінск, 28 красавіка 2015 / Пад рэд. К. А. Тананушкі. – Мінск: РІВШ, 2015. – С. 82 – 87.

6. Лёсік, Я. 1921 – 1930: Збор твораў / Укладанне, прадмова і каментары Жынкіна А. У. – Мінск: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь: Выдавецтва Логвінаў, 2003. – 396 с.

7. Кніга Беларусі, 1517—1917 [Электронны рэсурс]: зводны каталог / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. - Мінск : НББ, 2005. - 483 Мбайт)

8. Запрудскі, С. М. Да пытання аб дынаміцы узусу беларускай літаратурнай мовы ў 1920 – 1930-х гг. / С. М. Запрудскі // Язык и социум. Материалы V международной научной конференции: 6 – 7 декабря 2002 г., г. Минск. В 2 ч. Часть II. – Минск: РИВШ БГУ, 2003. – С. 173 – 177.

9. Захаров, В. В. Новые информационные технологии и филологические науки [Электронный ресурс] / В. В. Захаров // Знание. Понимание. Умение – 2007. – №1. – Режим доступа: http://www.zpu-journal.ru/e-zpu/1/Zakharov/. – Дата доступа: 25.01.2020.